# СЛОВА ПРА НАСТАЎНІКАЎ, ЦІ ПА СЛЯДАХ СТУДЭНЦКІХ ПРАКТЫК

**А. А. Смірнова**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*berezovskayae@mail.ru*

У артыкуле разглядаюцца асаблівасці студэнцкай практыкі. Аўтар фармулюе прынцыпы журналістыкі, правілы пошуку герояў для журналісцкага рэпартажу.

***Ключавыя словы:*** журналісцкая дзейнасць; прафесійная этыка журналіста; прынцыпы журналістыкі; радыёжурналістыка.

# A WORD ABOUT TEACHERS OR IN THE FOOTSTEPS OF STUDENT PRACTICES

**A. A. Smirnova**

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: A. A. Smirnova (berezovskayae@mail.ru)*

The article discusses the features of student practice. The author formulates the principles of journalism, the rules for finding heroes for journalistic reporting.

***Key words:*** journalistic activity; professional ethics of a journalist; principles of journalism; radio journalism.

Калі я паступіла на факультэт журналістыкі, мне было 17. Я нічога не ведала пра жыццё, яшчэ менш ведала пра журналістыку, але на факультэце мне давалося сустрэць сапраўдных настаўнікаў, якія не толькі адкрылі шлях у прафесію, але і навучылі бачыць цікавае ў паўсядзённым, быць дапытлівай і шукаць свой шлях. Так склалася, што большая частка майго прафесійнага жыцця прайшла менавіта на факультэце, але ўрокі сваіх настаўнікаў згадваю і сёння, дастаткова, напрыклад, адкрыць справаздачы па практыцы і пачытаць іх заўвагі, каментарыі.

Магчыма, для сённяшніх студэнтаў гэта будзе незвычайным, але ў нас не было ніякай схемы напісання справаздачы па практыцы, таму я старалася

заўсёды падыйсці да гэтага творча (адну справаздачу нават пісала ў вершаванай форме), каб майму кіраўніку Яканюку Данату Лявонцьевічу было цікава чытаць. Ён гэта цаніў і заўсёды станоўча ставіўся да маіх творчых эксперыментаў. На 4 курсе гэта было эсэ пад назвай «Дастукацца да нябёсаў» з пралогам і некалькімі часткамі – «стукамі».

Дазволю сабе ўзгадаць некаторыя ўрыўкі.

«Дастукацца да нябёсаў.

Пралог.

Прозвішча, імя, імя па бацьку: Беразоўская Алена Аляксандраўна.

Узрост: 20 гадоў.

Сацыяльнае становішча: студэнтка 4 курса факультэта журналістыкі БДУ.

Месца праходжання практыкі: Беларускае радыё, галоўная рэдакцыя грамадска-палітычных і сацыяльна-эканамічных праграм.

Мара: стаць патрэбнай.

Цяжкасць: недахоп часу і настойлівасці».

На той момант я ўжо супрацоўнічала з рэдакцыяй, але ніколі не сустракалася з галоўным рэдактарам – Малмыгай Таццянай Уладзіміраўнай, якая стала не толькі маім кіраўнікам па практыцы ў рэдакцыі, але і сапраўдным настаўнікам. Але тады я яе пабойвалася. Вось што пісала амаль 20 гадоў таму: «Таццяна Уладзіміраўна – чалавек таленавіты, вельмі апантаны журналістыкай, яна прафесіянал і, па словах рэдакцыі, добры кіраўнік. Але я яе крыху баюся. Калі так можна сказаць, то мая практыка стала "дастукваннем" да сэрца Таццяны Уладзіміраўны. Наколькі мне гэта ўдалося, я яшчэ цалкам не зразумела, але іспыт – заданне галоўнага рэдактара, здаецца, выканала».

Першае заданне было зрабіць матэрыял пра агракамбінат «Сноў» і ўзяць інтэрв'ю ў яго кіраўніка – Міхаіла Аляксандравіча Карчміта, які стаў Героем Беларусі. Спачатку Міхаіл Аляксандравіч прыняў мяне за дачку сваёй супрацоўніцы і ніяк не мог паверыць, што менавіта я (такая маладая) і ёсць журналістка, з якой ён дамаўляўся аб сустрэчы. Памятаю, што мне трэба было зрабіць два матэрыялы – адзін пра камбінат, а другі непасрэдна пра Міхаіла Аляксандравіча. Вядома, што мне больш цікава было рабіць другі матэрыял, бо што я магла ведаць пра сельскую гаспадарку, калі заўсёды жыла ў горадзе. А вось другая частка размовы была больш непрадказальнай і шчырай. Таццяне Уладзіміраўне матэрыял спадабаўся, таму «стук да сэрца галоўнага рэдактара ў мяне адбыўся і адазваўся мілагучным рэхам».

Увогуле Таццяна Уладзіміраўна заўсёды казала, што яе цікавяць людзі, вучыла, каб мы шукалі герояў, а не проста суха асвятлялі тэму. Калі ехалі ў камандзіроўку, трэба было прывезці некалькі «плёнак» і абавязкова каб

былі размовы з чалавекам. І часам героі знаходзіліся выпадкова. Калі ў Лепелі запісвала загадчыцу аддзела сацыяльнай абароны, то разам з намі заўсёды сядзела жанчына, ужо не маладая, але яе энергіі хапала, каб прыгатаваць нам каву, адказаць на ўсе тэлефанаванні, калі загадчыцы не было на месцы. Не, яна не была асабістым сакратаром. Яна адпрацавала ў гэтым аддзеле 40 гадоў, палову свайго жыцця, і нават калі ўжо выйшла на пенсію, працягвала прыходзіць і дапамагаць проста так. Нават сёння ўзгадваю гэту жыццярадасную жанчыну, якая перажыла Вялікую Айчынную вайну, але яна аптымістычны глядзела ў будучыню і так любіла сваю працу. Памятаю, што падчас гэтай практыкі я сфармулявала для сябе некалькі прафесійных прынцыпаў:

1. Кожнаму чалавеку ёсць што сказаць. Задача № 1 – слухаць.

2. Добрае пытанне – справа аднаразовая.

3. Размова можа быць кароткай, але падрыхтоўка да размовы павінна быць доўгай.

4. Адзіны журналісцкі візіт нічога не змяняе. Гэта рэпетыцыя.

5. Не трэба лезці ў душу, калі душа не адчыняе дзверы.

6. На свае пытанні трэба спачатку паспрабаваць адказаць самой.

7. За пытаннем «што» павінна ісці пытанне «чаму».

8. Няма людзей, якія не умеюць гаварыць. Ёсць мала людзей, якія змогуць разгаварыць.

9. Журналістыка – гэта спакуса. Небяспечна для асабістага жыцця.

10. Падчас інтэрв'ю ты – начальнік. Кіруй!

Можа, сёння гэтыя прынцыпы выглядаюць занадта максімалісцкімі, наіўнымі, але кожны з іх пасля правяраўся не на адным матэрыяле. Данат Лявонцьевіч заўседы даваў парады, рэагаваў на мае выказванні. Цікава сёння пачытаць і характарыстыку ад Таццяны Уладзіміраўны Малмыга, з якой мы ўжо шмат гадоў працуем разам на кафедры тэлебачання і радыёвяшчання: «Алена Беразоўская супрацоўнічае з Беларускім радыё з пачатку вучобы на факультэце. І я асабіста мела магчымасць назіраць і аналізаваць яе творчы рост».

Варта адзначыць, што свае журналісцкія матэрыялы мы нярэдка абмяркоўвалі і падчас заняткаў. З задавальненнем узгадваю заняткі з Валерыем Мікалаевічам Шэінам на курсе «Рэпарцёр радыё», калі мы ўключалі свае «плёнкі» і слухалі, што ў каго атрымалася, разбіралі памылкі, выказвалі меркаванні, пажаданні, што можна было зрабіць лепш.

Юбілей кафедры тэлебачання і радыёвяшчання – гэта добрая нагода, каб падзякаваць сваім настаўнікам, якія сталі не толькі праваднікамі ў прафесіі, але і сапраўднымі настаўнікамі па жыцці.